Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 33 (275) | Аўторак, 4 снежня 1956 года | Цана 20 кап.

ПАРТЫЙНУЮ РАБОТУ— НА ЎЗРОВЕНЬ НОВЫХ ЗАДАЧ

Дырэктывы XX з'езда партыі па шостаму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР прадугледжваюць вялікі рост вытворчых сіл нашай краіны. Рашыць гэтую задачу можна толькі пры ўсебаковым развіцці і ўкараненні ў вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі, пры бесперапынным росце тэхнічнага прагрэсу. Асноўная роля ў гэтай вялікай і адказнай справе належыць навуковым кадрам і спецыялістам.

Не выпадкова XX з'езд КПСС і паставіў перад вышэйшай школай адказныя задачы ў справе паляпшэння падрыхтоўкі кадраў для прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культурнага фронту.

Наш універсітэт з'яўляецца старэйшай навучальнай установай рэспублікі. Вось ужо 35 год БДУ рыхтуе высокакваліфікаваных настаўнікаў, журналістаў, юрыстаў і іншых спецыялістаў.

У народнай гаспадарцы рэспублікі працуе 12 тысяч выпускнікоў універсітэта. За гэты-ж час БДУ падрыхтавана сотні навуковых работнікаў.

Разам з тым нельга не бачыць вялікіх недахопаў у рабоце нашага калектыву. У арганізацыі вучэбнага працэсу яшчэ многа фармалізму і начотніцтва. Бо чым інакш вытлумачыць той факт, што да гэтага часу студэнты некаторых факультэтаў перагружаны лекцыямі?

Часта лекцыі чытаюцца на нізкім палітычным, навукова-педагагічным узроўні. Нягледзячы на прапанову Міністэрства вышэйшай адукацыі аб скарачэнні асобных курсаў і прадастаўленні студэнтам магчымасці больш займацца самастойна, вучэбная частка вельмі марудна і нерашуча праводзіць гэта ў жыццё.

Вельмі нізкая яшчэ дысцыпліна студэнтаў, што яскрава відаць па пропусках лекцый.

Многа лепшай павінна быць выхаваўчая работа.

Аб гэтых і многіх іншых недахопах гаварылі комуністы на нядаўна адбыўшымся справаздачна-выбарчым партыйным сходзе. Сход паказаў, што комуністы не кладуць мярыцца з такім становішчам спраў ва універсітэце. У адрас партыйнага камітэта і рэктарата была накіравана рэзкая і здаровая крытыка.

Трэба сказаць, што многія комуністы вельмі хваравіта успрымаюць крытыку. Гэта ілюструе выпадак з загадчыкам кафедры англійскай мовы т. Дорскім. Замест выпраўлення дапушчаных памылак, Дорскі увесь час стараўся адвесці ад сябе крытыку. Дзіўную пазіцыю заняў у гэтай справе прарэктар па вучэбнай рабоце т. Малышаў. І ў выніку кафедра да гэтага часу не наладзіла сваю работу.

Масу недахопаў мае гаспадарчая частка. Комуніст Бярэзін, які яе узначальвае, на ўсе крытычныя заўвагі дае самыя дакладныя і своечасовыя адказы, але далей гэтага справа не ідзе.

Выступіўшыя тт. Цімафеева, Рыдман і другія ўказвалі, што мала ўвагі ўдзяляецца жыллёва-бытавому пытанню супрацоўнікаў універсітэта.

Матэрыяльная база нашага універсітэта вельмі бедная. Дастаткова сказаць, што заняткі праходзяць у дзве змены.

Патрабуецца многа намаганняў партарганізацыі універсітэта, каб паспяхова вырашыць усе гэтыя пытанні.

Перш за ўсё неабходна ўзмацніць палітыка-выхаваўчую работу сярод студэнтаў. Група павінна стаць асноўным звяном гэтай работы. У гэтым кірунку многае павінны зрабіць выкладчыкі.

Палепшыць якасць чытаемых лекцый, вывучаць жыццё і быт студэнтаў, прывучаць іх да самастойнай працы—вось кола пытанняў, над вырашэннем якіх павінны працаваць прафесарска-выкладчыцкі састаў і партыйная арганізацыя.

Жыццё патрабуе рашуча пакончыць з усімі недахопамі ў нашай рабоце. Партыйная арганізацыя і ўвесь калектыў універсітэта маюць для гэтага усе магчымасці.

ДА ВЫНІКАЎ МЕТАДЫЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

Закончыла сваю работу II навукова-метадычная канферэнцыя універсітэта, прысвечаная 35-годдзю з дня заснавання БДУ імя В. І. Леніна. Усе 11 секцый, якія працавалі у гэты час, правялі па два—тры пасяджэнні, на якіх было праслухана і абмеркавана многа дакладаў. Сем дакладаў абмеркавала секцыя соцыяльна-эканамічных навук пад кіраўніцтвам прафесара І. Н. Лушчыцкага. Сярод іх «Методыка арганізацыі і правядзення семінарскіх заняткаў па дыялектычнаму і гістарычнаму матэрыялізму» дацэнта В. Н. Панкратава, «Аб выкарыстанні мастацкай літаратуры ў выкладанні гісторыі КПСС» кандыдата філасофскіх навук В. М. Сікорскага і іншыя.

Цікавыя даклады абмеркавалі і секцыі гістарычных, юрыдычных, філалагічных, матэматычных, хімічных навук і іншыя.

Работа канферэнцыі закончылася абмеркаваннем паведамленняў кіраўнікоў секцый.

Я. ГОМАН.

У гасцях у будучых артыстаў

Суботні вечар. Заняткі у тэатральным інстытуце ужо закончыліся, але студэнты сёння не спяшаюцца разыйсціся.

Нечым усхваляваныя, яны праходжваюцца па калідорах, збіраюцца у вестыбюлі. Ці не чакаюць яны каго-небудзь? Так. Да іх прыдуць сёння госці —трэцекурснікі аддзялення журналістыкі, для якіх будучыя акторы арганізоўваюць вечар сустрэчы. А вось і госці. Разам са сваімі студэнтамі іх ветліва сустракае загадчык кафедры майстэрства актора Р. А. Арлоў.

Так пачаўся 24 лістапада вечар сустрэчы будучых актораў і журналістаў.

Трэба адразу сказаць, што вечар атрымаўся добры. Было відаць, што студэнты-акторы пастараліся зрабіць так, каб госці не сумавалі.

Вечар пачаўся дэманстрацыяй фільмаў з гісторыі кіно. Перад паказам карціны т. Б. Я. Вішкароў коратка расказаў аб гісторыі кіно, аб першых нямых фільмах, аб вядомых акторах, якія ігралі ў іх. У зале тухне святло, і на экране узнікаюць постаці людзей з рэзкімі рухамі, нібы іх нехта нябачны смагае за полы. Такім было кіно ў тыя часы. «Вялікі нямы»—так называюць негукавое кіно. Але прайшоў час—і «Вялікі нямы» загаварыў.

Такое знаёмства з навуковым кіно было вельмі каштоўным для студэнтаў-журналістаў.

Вялікае ўражанне пакінуў фільм аб вядомым французскім майстру пантамімы Марселе Марсо, аб якім мы да гэтага ведалі вельмі мала.

Цікавым быў дакументальны фільм, расказваючы аб тэхніцы дубліравання на рускую мову зарубежных фільмаў.

Пасля дэманстрацыі фільмаў студэнты II курса паказалі прыгатаваныя імі эцюды і ўрыўкі з п'ес. Выступленні маладых артыстаў вельмі спадабаліся нашым студэнтам.

Пасля таго, як у апошні раз прагрымелі апладысменты і закрылася заслона, пачулася мелодыя вальса... Закружыліся першыя пары.

Студэнты III курса аддзялення журналістыкі засталіся вельмі удзячнымі будучым акторам за добры, цікавы вечар.

А. СТАНЮТА.

ХУТКА СЕСІЯ!

Зімняя экзаменацыйная сесія не за гарамі. Яе набліжэнне адчуваецца ўжо таму, што на многіх курсах поўным ходам ідуць семінарскія заняткі. Набліжэнне сесіі можна адчуць, заглянуўшы у лабараторыі, кабінеты, чытальныя залы. Яны запоўнены студэнтамі ад самага ранку да позняга вечара.

У галоўнай чытальнай зале, якая знаходзіцца у біялагічным корпусе, недзе нават яблыку упасці. Тут кожны заняты сваёй справай: хто рыхтуецца да семінару, хто да практычных заняткаў. Некаторыя узмоцнена вывучаюць літаратуру па тэмах дыпломных работ. А другія, забыўшыся аб усім на свеце, «дабіваюць тысячы» па замежных мовах. **(Фота 1).**

Заўсёды многалюдна і у кабінеце гісторыі КПСС. **(Фота 2).**

А паглядзіце, з якой стараннасцю рашаюць задачы па вышэйшай матэматыцы студэнткі хімічнага факультэта. Для гэтых дзяўчат прадстаячая сесія будзе першай. І яны да яе ідуць хоць і з хваляваннем, але упэўнена. Можна верыць, што іх праца не прападзе дарэмна.

Фотарэпартаж М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

Канстытуцыя перамогшага соцыялізма

20 год назад 5 снежня 1936 года дэлегаты Надзвычайнага VIII Усесаюзнага з'езда Советаў вталі новую Канстытуцыю СССР— Асноўны Закон Совецкай соцыялістычнай дзяржавы. Дзень 5 снежня стаў вялікім днём у жыцці совецкага народа.

Гэты дзень—дарагі працоўнаму народу. Ён знамянуе сабой перамогу ідэй марксізма-ленінізма, перамогу палітыкі нашай слаўнай Комуністычнай партыі. У Канстытуцыі СССР замацавана перамога соцыялізма у нашай краіне.

Два дзесяцігоддзі прайшло з дня прыняцця Канстытуцыі. За гэты час наша краіна вытрымала небывалыя выпрабаванні — дала адпор фашызму, які хацеў вярнуць нашы народы да старога. Але няма на свеце сілы, якая-б прымусіла народ, які адчуў перавагу новага жыцця, павярнуць назад. Совецкі народ з гонарам прайшоў усе выпрабаванні і вышаў з іх яшчэ больш магутным, згуртаваным. Сёння мы заняты мірнай стваральнай працай. У поле за штурвалам камбайна, у цаху каля мартэнаўскай печы, у даследчай лабараторыі—усюды совецкі чалавек—няхай гэта рускі, грузін, казах, украінец, беларус— адчувае сябе поунапраўным гаспадаром краіны. Гэтую упэўненасць зацвердзіла у ім Канстытуцыя СССР. Народ назваў яе Канстытуцыяй перамогшага соцыялізма.

Вялікія правы совецкіх грамадзян, свяшчэнныя іх абавязкі. Пастаянна удзельнічаюць працоўныя нашай краіны у кіраванні дзяржавай. На кожным кроку мы сустракаемся з вялікай стваральнай дзейнасцю народных мас, якія свядома твораць гісторыю. Комунізм стаў роднай справай мільёнаў.

Свой уклад у агульную справу уносіць і шматлікі калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Ва аудыторыях, лабараторыях і кабінетах сямі факультэтаў кіпіць жыццё. Тут побач з беларускай моладдзю слухаюць лекцыі віднейшых вучоных рэспублікі В. Н. Перцава. Н. Ф. Ермоленкі, Н. А. Дарожкіна, І. В. Гутарава, Б. І. Сцяпанава і многіх іншых канадзец Станіслаў Лінкевіч, пасланцы брацкай Польшчы Вера Паулоуская, Зоя Грыц, Люба Філіпік, Надзя Макасей, Шыман Раманчук, юнакі і дзяўчаты з брацкіх саюзных рэспублік. Дарогу да вышэйшай адукацыі адкрыла ім Канстытуцыя СССР.

Значэнне нашай Канстытуцыі неацэнімa. Канстытуцыя СССР— светач міру і дэмакратыі. Яна натхняе працоўных капіталістычных краін, якія змагаюцца за сваю свабоду і незалежнасць, за сваё шчасце.

Мільёны сумленных людзей ва ўсім свеце бачаць у нашай краіне сваю будучыню, сваю надзею. Іх натхняюць на барацьбу поспехі комуністычнага будаўніцтва ў СССР, якіх кожны дзень, кожны час дабіваюцца совецкія людзі, чыё жыццё асвятляе Канстытуцыя перамогшага соцыялізма.

Людзі краіны, якая перамогаюсна ідзе да комунізма, дабіваюцца новых поспехаў, новых перамог. Натхняцель усіх іх наша родная Комуністычная партыя.

І ў гэты дзень—дзень Канстытуцыі СССР—увесь совецкі народ звяртае свае думкі і пачуцці да яе—непераможнай Комуністычнай партыі Совецкага Саюза.

КРЫТЫКА І САМАКРЫТЫКА — ЗАКОН ПАРТЫЙНАГА ЖЫЦЦЯ

22 лістапада 1956 года адбыўся справаздачна-выбарчы сход партыйнай арганізацыі БДУ імя В. І. Леніна. Са справаздачным дакладам аб рабоце партыйнага камітэта выступіў сакратар партыйнай арганізацыі В. І. Старавойтаў.

Сход падвёў вынікі работы партыйнай арганізацыі за мінулы навучальны год і намеціў меры па далейшаму паляпшэнню арганізацыйна-партыйнай і масава-палітычнай работы, павышэнню ўзроўню вучэбнай і навуковай дзейнасці універсітэта.

Абран новы склад партыйнага камітэта, у які увайшло 11 чалавек:

Баравік Ф. В.
Гутараў І. В.
Ігнаценка І. М.
Кірсанаў А. В.
Лукашоў К. І.
Лушчыцкі І. Н.
Меркушаў М. Н.
Павецьеў Г. А.
Петрыкаў В. Т.
Старавойтаў В. І.
Шмыгаў Ф. П.

Сакратаром партыйнага камітэта абран В. І. Старавойтаў.

Навуковая і вучэбная работа

У сучасны момант калектыў навуковых работнікаў універсітэта працуе над вырашэннем 36-ці комплексных тэм, якія маюць вялікае народнагаспадарчае значэнне. Як сказаў у справаздачным дакладзе т. Старавойтаў, чатыры навуковых праблемы зацверджаны Акадэміяй навук БССР. Над гэтымі праблемамі працуюць прафесары Т. Н. Годнеу, Г. Г. Вінберг, М. М. Паулючэнка і калектыў кафедры фізікі і электрафізікі па праблеме поуправаднікоу.

Значна палепшыли работу многія кафедры. Аднак, як адзначылі ў сваіх выступленнях комуністы т. т. Фактаровіч, Рудзіцкі, Каванава, Волк і другія, у навуковай дзейнасці некаторых кафедраў маюцца яшчэ сур'ёзныя недахопы. Не ствараюць умоу для плённай навуковай работы на юрыдычным факультэце. Вельмі дрэнная абсталяванне мае кабінет крыміналістыкі. Як сказаў т. Рудзіцкі, гэты кабінет пры сваім убогім абсталяванні выглядае значна горш, чым 10—15 год таму назад. Дрэнна абсталяваны і іншыя кабінеты юрыдычнага факультэта. Аб гэтым ведаюць і АГЧ і партыйнь камітэт, але практычных мер да ліквідацыі гэтых недахопаў не прымаюць.

Ад сур'ёзных недахопах у навуковай рабоце кафедры англійскай мовы гаварыла т. Каванава. На кафедры няма ніводнага выкладчыка з навуковым званнем, а таму тут і узровень навуковай работы нізкі. Уся дзейнасць кафедры абмежавана складаннем метадычных дапаможнікаў, даведнікаў і г. д. Кабінет замежных моу не мае самага неабходнага абсталявання. Справядліва крытыкавалася, гаворыць Каванава, наша кафедра ў газеце «Беларускі універсітэт». Перабудаваць работу кафедры без дапамогі рэктарата вельмі цяжка. Аднак гэтай дапамогі, нажаль, нямае.

Не зусім яшчэ наладжана работа выдавецтва БДУ. Хоць за год і было выдадзена 23 кнігі, але гэтая лічба ніяк не можа задаволіць нас. Пры такім вялікім калектыве навуковых работнікаў, якія ёсць ва універсітэце, у выдавецтве павінна выходзіць значна больш навуковых кніг, падручнікаў, манаграфій і г. д. Адной з сур'ёзных прычын, якія перашкаджаюць рабоце выдавецтва, з'яуляецца несвоечасовае прадстауленне рукапісаў закончанных работ. Недастаткова аператыуна працуе і само выдавецтва (дырэктар т. Кручкоу).

У авангардзе студэнцкай моладзі у барацьбе за высокую паспяховасць ідуць студэнты-комуністы, якія у большасці сваёй дасягнулі не толькі выдатнай паспяховасці, але і актыуна удзельнічаюць у партыйным і, наогул, у грамадскім жыцці. Комуністы Зяцькоу, Цярпігор'ева (фізмат), Клімау, Зімак (філалагічны факультэт), Майсеенка, Серафімовіч (юрыдычны факультэт) з'яуляюцца надзейнай апорай партыйнай арганізацыі універсітэта у яе рабоце са студэнтамі, бо гэтыя таварышы карыстаюцца павагай і аўтарытэтам сярод студэнцкага калектыву. Сваім асабістым прыкладам яны паказваюць студэнтам, як трэба жыць і вучыцца.

Абмяркоўваючы важныя і вялікія задачы, партком часта забывау аб людзях, аб радавых комуністах. За цэлы год партком не абмеркаваў ніводнай справаздачы аб рабоце партбюро факультэтау са студэнтамі-комуністамі.

Унутрыпартыйная работа

Абмяркоуваючы справаздачу аб рабоце партыйнага камітэта, комуністы справядліва указалі, што ацаніць работу партыйнай арганізацыі за прайшоушы год можна толькі пры умове, калі падыходзіць да гэтай ацэнкі з таго пункту гледжання, што зрабілі і што павінны былі зрабіць комуністы для ажыццяўлення гістарычных рашэнняу XX з'езда КПСС у нашых канкрэтных умовах. Многа увагі ў сваіх выступленнях комуністы удзялялі пытанням унутрыпартыйнай работы. Аб гэтым гаварылі т. т. Сікорскі, Гутараў, Кляуко і другія. Было-б, зразумела, несправядліва сцвярджаць, што партком і калектыў цалкам мала займаліся пытаннямі выхавання студэнтау, вучэбнай і навуковай работай і ажыўленнем непасрэдна самой партыйнай работы. Зроблена многа. Але ёсць і сур'ёзныя недахопы.

Вельмі мала зроблена партыйнай арганізацыяй у справе рэалізацыі прынятых рашэнняу. Адным з галоуных недахопау унутрыпартыйнай работы, як гэта было адзначана ў справаздачным дакладзе, з'яуляецца тое, што не усе яшчэ комуністы пераадолелі шаблон і фармалізм у гэтай справе.

— Я з'яуляюся членам партыйнай арганізацыі філалагічнага факультэта,—гаварыў на сходзе т. Сікорскі,—і не маю магчымасці меркаваць аб унутрыпартыйнай рабоце на іншых факультэтах. Але аб сваім факультэце я магу сказаць, што з васьмі праведзеных за год сходау толькі адзін прайшоу па-дзелавому, прынцыпова і выклікаў вялікую актыунасць комуністаў. Астатнія сходы, як правіла, праходзілі фармальна, на іх выступалі «дзяжурныя» аратары, прымаліся напісаныя Зярнішкім або кім другім рэзалюцыі і ўсё. Ды нямногім лепш праходзілі і некаторыя агульнауніверсітэцкія сходы. Так, напрыклад, прайшоу сход, на якім абмяркоувалі вынікі з'езда. А чаму абмеркаванне такога важнага пытання не выклікала актыунасці комуністаў? Ды хоць-бы таму, што партком не падрыхтаваў сход, а ў некаторай ступені і таму, што комуністы чакалі дакладчыкам каго-небудзь з кіруючых работнікау рэспублікі, законна думаючы, што яны павінны хоць зрэдку і, тым больш, пры абмеркаванні важных пытанняу, бываць і выступаць у такой буйнай арганізацыі, як наша. Трэба прыняць усе меры да таго, каб пакончыць з пасіунасцю і абыякавасцю комуністау у ліквідацыі недахопау у нашай унутрыпартыйнай рабоце.

Навучанне і выхаванне неаддзялімы

Вострай крытыцы на партыйным сходзе была падвергнута палітыка-выхаваўчая работа ва універсітэце. За нездавальняючую пастаноуку яе, сказаў у справаздачным дакладзе т. Старавойтаў, універсітэт крытыкаваўся на раённай, гарадской і абласной канферэнцыях у мінулым годзе. Ці зроблены-ж былі вывады з гэтай крытыкі у партыйнай арганізацыі? Так, былі. Аб гэтым красамоуна сведчаць факты.

На тэму аб паляпшэнні палітыка-выхаваўчай работы быу праведзен агульнауніверсітэцкі партыйны сход, на якім комуністы унеслі рад каштоуных прапаноу аб паляпшэнні метадау і форм палітыка-выхаваўчай работы. Сур'ёзныя мерапрыемствы былі распрацаваны партыйным камітэтам. Усё гэта дало свае вынікі. Больш рознастайнымі сталі, як па форме, так і па зместу праводзімыя мерапрыемствы. Значна палепшылася дысцыпліна.

Аднак факты парушэння вучэбнай дысцыпліны і амаральныя учынкі асобных студэнтау усё яшчэ маюць месца у нашым калектыве. Аб гэтым правільна гаварылі і дакладчык, і выступіушыя на сходзе комуністы тт. Фактаровіч, Захарава, Каванава, Кляуко, Сікорскі і другія.

— Многія выкладчыкі,—сказаў т. Фактаровіч,—сваю выхаваучую работу праводзяць беззмястоуна. Часта у нас гэтую работу ацэньваюць па колькасці тых або іншых праведзеных мерапрыемстваў: культпаходы, наведванне музеяу і г. д. Але тут забываюць аб галоуным—аб выхаванні студэнтау у працы. Трэба, каб выкладчыкі выхоувалі студэнтау у працэсе навучання. Перш за усё студэнтам трэба прывіць навыкі самастойнай працы. Аб гэтым у нас многа любяць гаварыць на сходах, нарадах і г. д., а робіцца вельмі мала.

Адным з сур'ёзных недахопау у палітыка-выхаваўчай рабоце з'яуляецца тое, што яна часта носіць характар агульных мерапрыемстваў. Але ніхто не жадае падыйсці бліжэй да жыцця студэнтау, пацікавіцца іх настроем, інтарэсамі, запатрабаваннямі.

Важнейшую ролю ў комуністычным выхаванні моладзі павінен іграць прафесарска-выкладчыцкі састаў.

Навучанне і выхаванне неаддзялімы. Як добра ні была-б пастаўлена вучэбная работа, без выхаваучай дзейнасці яна не будзе мець эфекту.

Палітыка-выхаваучая работа у ВНУ мае вельмі многа форм, і магчымасці выкладчыкаў у гэтых адносінах надзвычай вялікія. Аб гэтым сведчыць вопыт работы такіх выкладчыкаў, як Мелкіх, Баранава, Мельцер, Барзова і другія. Чаму-б партыйнаму камітэту не заняцца абагульненнем іх вопыту?—такое справядлівае пытанне на сходзе задала комуністка т. Каванава. І сапраўды, партком упусціу гэта з-пад увагі.

Асабліва дрэнна вядзецца выхаваўчая работа у інтэрнатах. Выкладчыкі тут зусім не бываюць.

Партыйнай арганізацыі універсітэта трэба знайсці нейкія новыя формы выхаваучай работы, зжыць казёншчыну і фармалізм, якія яшчэ маюць месца.

Але не толькі выкладчыкі, а і студэнты-комуністы павінны актыуна ўмешвацца у жыццё студэнтау. Аб гэтым гаварыла ў сваім выступленні т. Захарава.

Газета павінна быць трыбунай крытыкі

Друк з'яуляецца найбольш вострай зброяй нашай партыі, магутным сродкам комуністычнага выхавання мас. Цяжка пераацаніць значэнне газеты у справе мабілізацыі студэнтау і прафесарска-выкладчыцкага складу на далейшае павышэнне якасці навучаня і навукова-даследчай работы. Але газета можа паспяхова выканаць ускладзеныя на яе задачы толькі пры умове шырока разгорнутай на яе старонках крытыкі і самакрытыкі.

Вядома, нельга сказаць, што газета «Беларускі універсітэт» поунасцю справілася са сваімі задачамі. Аб гэтым неаднаразова ужо гаварылася і на комсамольскіх, і на прафсаюзных, і на партыйных сходах. Але ці можна такое становішча тлумачыць нежаданнем работнікау рэдакцыі узнімаць вострыя пытанні? Не. У мінулым навучальным годзе у газеце быу змешчаны цэлы рад вострых злабадзённых артыкулау і фельетонау. Але бяда у тым, што у нас ёсць яшчэ такія комуністы, якія хваравіта, не па-партыйнаму успрыймаюць крытычныя выступленні газеты. Боязь вынесці смецце з хаты кіруе некаторымі работнікамі універсітэта. Вось некалькі прыкладау.

У № 4 «Беларускага універсітэта» ад 9 студзеня гэтага года быу змешчаны артыкул «У абстаноуцы бескантрольнасці», у якім справядліва крытыкавалася работа кафедры англійскай мовы. У даным выпадку прыслухацца да крытыкі:—і недахопы быліб лік відаваны. Аднак гэтага не здарылася. Маючы некаторую падтрымку з боку рэктарата, у прыватнасці т. Малышава, загадчык кафедры т. Дорскі накіраваў сваю дзейнасць і энергію не на ліквідацыю маючыхся недахопау у рабоце кафедры, а на тое, каб аганьбіць газету. І толькі умяшанне партыйнага камітэта прымусіла т. Дорскага успрыняць крытыку так, як гэтага патрабуе Статут партыі. У № 25 «Беларускага універсітэта» ад 20 снежня мінулага года быу змешчан крытычны артыкул «Не на сваім месцы». Зусім незразумела, чаму партыйная арганізацыя адміністрацыйна-гаспадарчай часткі на працягу доугага часу рабіла выгляд, што не заўважыла гэтага артыкула.

У № 19 ад 11 чэрвеня гэтага года газета надрукавала фельетон «Запіскі аб адным клубе.». Фельетон абмяркоуваўся на пашыраным пасяджэнні камітэта комсамола універсітэта, дзе факты, указаныя у фельетоне, пацвердзіліся. Рашэннем камітэта ЛКСМБ універсітэта тры чалавекі былі выключаны з комсамола. Акрамя таго, камітэт звярнуўся з хадайніцтвам у рэктарат аб выключэнні гэтых-жа людзей з універсітэта. Аднак і на гэты раз у абвінавачваемых знайшліся адвакаты. Прарэктар універсітэта тав. Малышау замест таго, каб прынцыпова разабрацца ў гэтай справе і па-партыйнаму ацаніць амаральныя учынкі, зробленыя студэнтамі, стау на іх абарону. Такія адносіны да крытыкі нецярпімы. Трэба сказаць, што партыйны камітэт аб'ектыуна падыйшоў да ацэнкі фактау і падтрымау рэдакцыю. Але партком не паправіу тых, хто няправільна рэагаваў на крытычныя выступленні, і гэта абъектыўна не садзейнічала разгортванню крытыкі. Можа, таму за апошнія тры месяцы на старонках газеты радзей і радзей пачалі паяўляцца крытычныя матэрыялы.

Падобныя факты можна працягнуць. Усе яны гавораць аб маючыхся ва універсітэце выпадках нецярпімых адносін да крытыкі. Гэта ў значнай ступені абмяжоувае магчымасць газеты ў барацьбе за ліквідацыю маючыхся недахопаў. Такія адносіны да выступленняў у друку ніяк не садзейнічаюць развіццю крытыкі.

Абавязак кожнага комуніста састаіць у тым, каб актыуна падтрымліваць крытычныя выступленні друку, вучыць студэнтау і работнікаў універсітэта правільна адносіцца да крытыкі, рабіць з яе правільныя вывады, настойліва ліквідаваць недахопы. Газета павінна стаць трыбунай крытыкі і самакрытыкі.

З пастановы агульнага справаздачна-выбарчага партыйнага сходу

Партыйнаму камітэту новага складу і усёй партыйнай арганізацыі у аснову сваёй дзейнасці пакласці няухільнае ажыццяўленне рашэнняў гістарычных пастаноў XX з'езда КПСС, памятаючы пры гэтым, што барацьба за далейшае разгортванне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, за ажыўленне усяго партыйнага жыцця, за ўцягненне усіх комуністаў у гэтае жыццё і за развіццё іх ініцыятывы павінна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі усёй партыйнай арганізацыі.

Лічачы недастатковым узровень крытыкі і самакрытыкі, і спробы некаторых комуністаў няправільна рэагаваць на крытыку недахопаў у іх рабоце, партыйны сход патрабуе ад парткома новага складу дабіцца рашучага пералому у гэтай справе. Партыйны сход даручае парткому разгарнуць смелую, дзелавую крытыку недахопаў як на партыйных сходах, так і на старонках шматтыражкі. Трэба павесці рашучую барацьбу супроць заціску крытыкі, прыцягваючы вінаватых у гэтай справе да суровай партыйнай адказнасці.

Партыйны сход рэкамендуе новаму камітэту больш глыбока займацца работай вучоных саветаў і кафедраў. Неабходна арганізаваць дапамогу кафедрам і аб'яднаным вучоным саветам факультэтаў у стварэнні сапраўды творчага духу. Рэзка крытыкаваць недахопы і атмасферу самазаспакоенасці.

Партыйным арганізацыям факультэтаў партыйны сход даручае арыентаваць кафедры на сістэматычную дапамогу завочнаму факультэту з тым, каб пытанні завочнага навучання зрабіліся арганічнай часткай работы кафедраў універсітэта.

Партыйны сход лічыць, што нельга далей мірыцца з нізкім узроўнем палітыка-выхаваўчай работы ва універсітэце. Абавязаць партыйны камітэт дабіцца большай рознастайнасці форм выхаваўчай работы, пераносячы цэнтр яе у акадэмічныя групы. Сістэматычна вывучаць і абагульняць лепшы вопыт палітыка-выхаваўчай работы ў групах і шырока прапагандаваць яго. Газеце «Беларускі універсітэт» і насценнаму друку факультэтаў весці непрымірымую барацьбу супраць фактаў парушэння комуністычнай маралі, выносячы іх на шырокі суд грамадскасці.

Партыйны сход прапануе парткому радыкальна палепшыць кірауніцтва грамадскімі арганізацыямі, а таксама добраахвотнымі таварыствамі, не абмяжоўвацца фармальным кіраўніцтвам і дробязнай апекай, а максімальна развіваць іх ініцыятыву і самадзейнасць.

ЮБІЛЕЙНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА СОВЕТА, ПРЫСВЕЧАНАЕ 35-ГОДДЗЮ БДУ

23 лістапада, 6 гадзін вечара. Партэр, ложы і балкон Беларускага Дзяржаунага ордэна Леніна тэатра оперы і балету запаўняюць члены шматлікага калектыва універсітэта, госці. Яны прыйшлі сюды на урачыстае пасяджэнне, прысвечанае юбілею Беларускага дзяржаунага універсітэта.

Рэктар БДУ прафесар К. І. Лукашоў абвяшчае пасяджэнне адкрытым. Урачыста гучаць Гімн Совецкага Саюза і Гімн Беларускай ССР. Сакратар партыйнай арганізацыі універсітэта В. І. Старавойтау прадастауляе слова для даклада К. І. Лукашову. Уважліва слухаюць прысутныя, які шлях прайшоу універсітэт за 35 год.

Толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі мара пакаленняу беларускага народа здзейснілася. Дэкрэтам СНК, які быу падпісаны В. І. Леніным, быу пакладзены пачатак стварэння БДУ. 11 ліпеня 1921 года адбылося урачыстае пасяджэнне партыйных, совецкіх і профсаюзных арганізацый г. Мінска, прысвечанае адкрыццю універсітэта. Першымі арганізатарамі універсітэта былі відныя вучоныя В. І. Пічэта (першы рэктар універсітэта), Н. М. Нікольскі, Н. Ф. Бліадуха, В. Н. Перцау, С. Я. Вальфсон і другія. Упершыню у гісторыі беларускага народа была створана магчымасць рыхтаваць свае нацыянальныя кадры.

Цяжка было працаваць у першыя гады. Нехапала лабараторый, аудыторый, прафесараў і выкладчыкаў. Але з дапамогай партыі і ўрада універсітэт рос і пашыраўся з года ў год, ператвараўся у цэнтр падрыхтоукі кадраў нацыянальнай інтэлігенцыі. Ужо у 1927—1928 навучальным годзе налічвалася 2672 студэнты.

У 1941 годзе БДУ меу 6 факультэтаў, на якіх вучылася каля 1600 студэнтаў. На 33 кафедрах працавала 17 прафесараў, 41 дацэнт, 42 старэйшых выкладчыкі. Фундаментальная бібліятэка універсітэта налічвала каля 220 тысяч тамоў. Ею карысталася усё насельніцтва Мінска.

Развіццё БДУ было перарвана вераломным нападам фашысцкай Германіі на нашу краіну. Універсітэт павінен быу эвакуіравацца і прадаужаў сваю працу на станцыі Сходня пад Масквой. Акупанты нанеслі вялікую шкоду універсітэту: спалілі і узарвалі большасць будынкаў універсітэта, абрабавалі лабараторыі, абсталяванне. З 220 тысяч тамоў літаратуры уцалела толькі 22 тысячы.

Адразу-ж пасля вызвалення пачалася праца па аднаўленню універсітэта. У 1945—47 гадах тут ужо вучылася 900 студэнтаў. У сувязі з 30-годдзем Беларускай ССР універсітэту было прысвоена імя В. І. Леніна.

За 35 год свайго існавання БДУ з гонарам выканау ускладзеную на яго задачу у падрыхтоцы нацыянальных кадраў. За гэты перыяд універсітэт падрыхтаваў 12 тысяч кваліфікаваных спецыялістаў па рознастайных галінах ведау, вырасціу значную колькасць навуковых кадраў. Зараз у БДУ маецца 7 факультэтаў, 44 кафедры, якія аб'ядноуваюць працу звыш 300 навуковых работнікау, у тым ліку звыш 30 дактароу, каля 100 дацэнтау і кандыдатау навук. Створаны дзве навуковыя станцыі. Кніжны фонд бібліятэкі перавышае 400 тысяч тамоу.

Пры кафедрах універсітэта працуе 35 кабінетау, 44 лабараторыі. На стацыянары зараз навучаецца 3200 студэнтау і 3100 на завочным аддзяленні. Ва універсітэце створаны спрыяльныя умовы для падрыхтоукі і росту навуковых кадраў. 130 чалавек займаецца у аспірантуры. Універсітэту прадастауле на права прысуджэння доктарскіх і кандыдацкіх званняу па некаторых навуках.

Вучоныя універсітэта прымаюць удзел у розных навуковых міжнародных канферэнцыях і канграсах. Так, напрыклад, вучоныя БДУ удзельнічалі у Жэнеускай (1955 год) і Нью-Йоркскай канферэнцыях па выкарыстанню атамнай энергіі у мірных мэтах, на кангрэсе Міжнароднай асацыяцыі універсітэтау у Стамбуле (1955 год), на Геалагічным кангрэсе у Мексіцы (1956 год) на канферэнцыі ЮНЕСКО (1956 год). Пашыраецца навуковае супрацоуніцтва з вучонымі іншых краін.

35 год плённай працы на карысць нашай Радзіме прынесці універсітэту вялікія здабыткі.

І тым больш прыемна у гэты дзень падзяліцца успамінамі, расказаць аб тых гадах, калі толькі пачынала расці Беларусь.

Старэйшы вучоны універсітэта В. Н. Перцау, які працуе тут з 1921 года, сказау, што раней будынак універсітэта знаходзіуся на вуліцы Кірава і меу усяго тры аудыторыі. Цяжка было працаваць, не было праграм, вучэбных падручнікау. Меуся усяго адзін факультэт—грамадскіх навук. У яго уваходзілі гістарычнае, філалагічнае, прыродазнаучае і іншыя аддзяленні.

На лекцыях тады прысутнічала шмат вольных наведвальнікау—рабочых, салдат. Лекцыі часта прымалі публічны характар. За адным сталом можна было бачыць цэлую сям'ю. Разам сядзелі бацька і сын, маці і дачка і нават бабуля з унучкай.

Наш універсітэт выхаваў не толькі кваліфікаваных спецыялістау, але і адданых Радзіме людзей.

— У 1943 годзе,—успамінае прафесар Т. Н. Годнеу,—калі ішлі жорсткія баі за вызваленне Радзімы ад фашыстау, П. К. Панамарэнка сабрау сход і ад усяго сэрца падзякваў нас за тое, што у БДУ выхаваліся высокародныя, мужныя людзі.

З успамінамі аб былых гадах працы ва універсітэце выступаюць прафесары Н. Ф. Ермоленка і І. В. Гутарау.

Затым з віншавальным словам ад імя ЦК ЛКСМБ выступае сакратар ЛКСМБ т. Краснова. Юбіляра віншавалі таксама прадстаунікі Мінскага політэхнічнага інстытута, Беларускага інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

Сакратар Прэзідыума Вярхоунага Совета БССР т. Лукашэвіч абвяшчае указ Урада Беларусі аб узнагароджанні Ганаровымі Граматамі і Граматамі Вярхоунага Совета БССР работнікау універсітэта. Тут-жа адбылося уручэнне узнагарод.

В. МАЦКЕВІЧ.

З АПОШНЯЙ ПОШТЫ

М. Цікоцкі, этыка і фантазія

(Пяць парад рэдактару „Авадня")

Выйшау 6-ты выпуск «Авадня». Здавалася-б, гэта з'ява прыемная, таму што «Авадзень» выходзіць даволі рэдка. Толькі чамусь, акінуушы поглядам новы выпуск, чытачы адыходзяць ад стэнда абыякавымі, не закранула іх крытыка.

Рэдактар «Авадня»—М. Е. Цікоцкі. Ці не ён бегау па універсітэту, збіраючы факты, выкарыстоуваючы усю сваю фантазію... А фантазія у Цікоцкага працуе, на вялікі жаль, не у патрэбным кірунку.

Аб гэтым яскрава сведчыць карыкатура на тт. Волка і Вараб'ёва.

Тав. Цікоцкаму павінна быць вядома, што А. Волк, працуючы ужо некалькі год у БДУ, з'яуляецца членам мясцкома, а не прафкома, таму апошні не можа выдаць А. Волку для асабістых патрэб 450 рублёу. Добра вядома рэдактару «Авадня» і тое, што грошы былі узяты для абсталявання фоталабараторыі, аб чым гаварылася на профсаюзнай канферэнцыі і аб чым нічога не сказана у «Авадні».

Да таго-ж карыкатура выглядае насмешкай над прозвішчамі. Далёка тут да самай прымітыунай этыкі.

Не лепшымі выглядаюць і многія іншыя карыкатуры, змешчаныя у «Авадні». У пагоні за сенсацыяй, М. Цікоцкі чапляецца за любы факт, не раздумваючы доуга аб выніках.

Калі была намалявана карыкатура на жыхароу аднаго з пакояў інтэрната па вуліцы Свердлова, рэдактару «Авадня» паведамілі, што факты не адпавядаюць сапраўднасці. На гэта ён каротка кінуу:

— Няма чаго ставіць. Дайце другі факт, здыму.

Факта не знайшлося, карыкатура выйшла у свет.

Звычайна, сенсацыя не атрымоуваецца, бо самыя рознастайныя па зместу карыкатуры, як блізняты падобны адна на другую: намаляваны які-небудзь брыдкі твар, подпіс—даволі плоскі жарт.

Час-ад-часу і паяуляецца у «Авадні» што-небудзь арыгінальнае, але потым аказваецца, што гэта «запазычана» з сатырычных факультэцкіх газет. Часцей за усё з «Пылесоса» (фізмат).

У далёкае паданне адыйшлі тыя дні, калі у рэдакцыі «Авадня» было звыш 20 чалавек—яго актывістау. Толькі усе яны разбегліся ў розныя бакі—не было каму стварыць працаздольны састау рэдкалегіі. Няма яе і зараз. Ёсць толькі адзін Цікоцкі, які карыстаецца кожнай неправеранай чуткай, кожным мелкім фактам, каб толькі запоуніць чатыры аркушы ватманскай паперы.

Няхай-жа ведае рэдактар «Авадня» т. Цікоцкі, што парушаць прынцыпы друку нікому не дазволена, што

1) 99 працэнтау работы журналіста—праверка фактау;

2) плагіят — літаратурны крадзеж;

3) мелка для журналіста насмяхацца над прозвішчамі;

4) сіла—у калектыве;

5) «Авадзень»—усяго толькі сатырычны дадатак газеты «Беларускі універсітэт», таму крытыкаваць у ім рэдакцыю і яе работнікау не да месца.

Рэдкалегія газеты «Беларускі універсітэт».

ПЕРШЫЯ ЗАНЯТКІ ФІЛАСОФСКАГА СЕМІНАРА БІЁЛАГАЎ

У гэтым годзе на біёлага-глебавым факультэце арганізаван філасофскі семінар для прафесарска-выкладчыцкага складу.

Арганізацыя семінара мае вялікае значэнне для вывучэння важнейшых агульна-філасофскіх пытанняу біялогіі. Першыя заняткі семінара былі прысвечаны абмеркаванню пытанняу тэматыкі. Кіраўніком семінара—кандыдатам філасофскіх навук А. І. Ляуко—была рэкамендавана агульна-тэарэтычная і філасофская тэма: «Фарміраванне і развіццё катэгорый матэрыялістычнай дыялектыкі на аснове гісторыі біялогіі». Па гэтай тэме па просьбе членау філасофскага семінара т. Ляуко правёу днямі гутарку, у якой узняу пытанні узаемаадносін і субардзінацыі катэгорый матэрыялістычнай дыялектыкі. Гутарка праводзілася у шырокім плане значэння структуры катэгорый матэрыялістычнай дыялектыкі для пазнавання з'яу аб'ектыунай рэчаіснасці, а таксама пытання аб аб'ектыуных крытэрыях і субардзінацыі матэрыялістычнай дыялектыкі. Абмеркаванне узятых А. І. Ляуко пытанняу і тэматыкі праводзілася у шырокім святле сучаснага становішча навуковай думкі пры узгадненні палажэнняу матэрыялістычнай дыялектыкі з важнейшымі агульна-філасофскімі праблемамі біялогіі і выклікала вялікую цікавасць у слухачоў.

У абмеркаванні узнятых пытанняу і намечанай тэматыкі заняткау прынялі удзел усе члены семінара. Пасля гэтага у адпаведнасці з агульнай тэмай удзельнікі семінару узялі распрацаваць рад падтэм, якія будуць слухацца у выглядзе самастойных дакладау.

У снежні месяцы намечана заслухаць даклад акадэміка Т. Н. Годнева на тэму: «Фотасінтэз і яго філасофскае абгрунтаванне», а таксама даклад дацэнта А. І. Паллава: «Праблема адзінства анта- і філагінеза і яе значэнне для фарміравання асноуных катэгорый дыялектыкі». Другія намечаныя тэмы дакладаў будуць заслуханы і абмеркаваны ў наступным годзе згодна з планам заняткау семінара.

В. ВАРОНІН,
стараста гуртка.

ВЕЧАР СУСТРЭЧЫ

Заусёды вельмі цікава і ажыулена праходзяць сустрэчы гледачоу з артыстамі, асабліва. калі гэтымі гледачамі з'яуляецца моладзь, якая выстауляе свае патрабаванні да ігры артыстаў, імкнецца убачыць на нашай сцэне найбольш цікавыя, захапляючыя п'есы з выдатна створанымі і запамінальнымі вобразамі.

27 лістапада па ініцыятыве студэнтау II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры адбылася сустрэча з артыстамі Беларускага дзяржаунага тэатра імя Я. Купалы. Шмат студэнтау сабралася на яе.

Першым выступіу народны артыст БССР С. С. Бірыла. Ён расказау аб тым, як калектыу тэатра змагаецца за ажыццяўленне рашэнняу XX з'езда КПСС—больш ярка паказаць вобраз нашага сучасніка, будаўніка комуністычнага грамадства.

— Адной з характэрных рыс тэатра,—гаворыць ён,—з'яуляецца тое, што ён яшчэ у 1929 годзе адным з першых тэатрау краіны стварыу вобраз чалавека совецкай эпохі, праудзіва адлюстравау жыццё і удзельнічау у алімпіядзе тэатрау СССР у 1930 годзе.

С. С. Бірыла падзяліуся уражаннямі аб паездцы калектыву тэатра у Польшчу, дзе яны паказалі п'есу «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Даходнае месца» Астроускага, «Рамео і Джульета» Шэкспіра і іншыя. Гэтая паездка прайшла з вялікім поспехам. Выступаючы расказау таксама аб планах тэатра на 1957 год.

Беларускі глядач убачыць п'есу І. Мележа аб совецкай моладзі «Пакуль вы маладыя», югаслаускую камедыю «Пані міністэрша», англійскі спектакль «Тайны шлюб».

На вечары галоуным чынам абмяркоувалася п'еса З. Бядулі «Салавей».

Артысты Драздова, Уладамірскі, Кашэльнікава, Казлоўскі, Дакальская, Лапцінскі расказалі студэнтам аб сваёй працы у тэатры, аб іх намаганні стварыць на сцэне найбольш праудзівыя вобразы.

З крытычнымі заўвагамі аб п'есе і ігры у ёй выступілі студэнты Сачанка, Шупенька, Бечык, Маісейшын, Саламевіч. Яны правільна адзначалі рад недахопаў у ігры артыстаў. Але ўсе яны падкрэслівалі, што наогул п'еса з'яуляецца вялікім дасягненнем калектыву тэатра.

Ад імя польскіх студэнтау гасцей вітала В. Паўлоўская. Яна расказала з якім вялікім захапленнем сустрэлі гледачы. Польшчы гастролі беларускіх артыстаў.

Ад імя выкладчыкаў і студэнтау артыстаў падзякваў дэкан філфака М. Г. Ларчанка, які запрасіу іх часцей прыходзіць у госці да студэнтаў.

А. ЧАРНЕНКАВА.

Даклады, лекцыі, справаздачы

Члены гуртка журналістыкі запрасілі да сябе кандыдата філасофскіх навук Е. Л. Бондараву, якая нядауна вярнулася з падарожжа вакол Еуропы на цеплаходзе «Пабеда». Яна падзялілася з гурткоуцамі сваімі уражаннямі, расказала пра некаторыя звычкі, гістарычныя помнікі большасці еурапейскіх краін.

Студэнты з вялікай цікавасцю праслухалі расказ Бондаравай і горача дзякавалі ей.

* * *

Многа студэнтау хімічнага факультэта прыйшло на даклад прафесара Ф. Г. Асіпенкі, які меу цікавую назву «Сучасныя мыючыя сродкі і дэтэргенты». Члены гуртка арганічнай хіміі засталіся вельмі удзячнымі дакладчыку. Яны задавалі многа пытанняу, на якія дакладчык дау вычарпальныя адказы.

* * *

Са справаздачай аб рабоце СНТ філфака выступіла студэнтка V курса аддзялення рускай мовы і літаратуры С. Клiменценка. Затым было абрана новае кіраўніцтва студэнцкага навуковага таварыства філалагічнага факультэта, а яго старшынёй абран студэнт II курса аддзяленя журналістыкі Б. Сачанка, які добра зарэкамендаваў сябе сваёй першай працай, атрымаушы высокую ацэнку на гарадскім аглядзе студэнцкіх навуковых работ.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

У ГУТАРЦЫ З ПАСЛАНЦАМІ КАНАДЫ

Па запрашэнню Беларускага таварыства культурнай сувязі з замежнымі краінамі «Федэрацыя рускіх канадцаў» прыслала у Мінск трох канадцаў, якія будуць займацца у нас на працягу двух год. Сярод іх Яраслаў Кавалевіч, Станіслаў Лінкевіч і Валянціна Плаксіна. Станіслаў Лінкевіч прыехаў з Таранто, дзе ён быў вядомы, як рэдактар газеты «Чэмпіён»—органа канадскай прагрэсіўнай моладзі. Яраслаў Кавалевіч жыў у Таранто, дзе ён працаваў у Польскім консульстве. Валянціна Плаксіна працавала сакратаром фірмы у Ванкувере. У сучасны момант Станіслаў Лінкевіч з'яўляецца навучэнцам БДУ, а Валянціна Плаксіна і Яраслаў Кавалевіч займаюцца у кансерваторыі.

Днямі ад імя рэдакцыі радыёгазеты геолага-геаграфічнага факультэта я наведаў пасланцаў Канады і папрасіў адказаць на рад пытанняў.



Ніжэй—змест гутаркі.

Лукашоў: Якое уражанне зрабіў на вас БДУ?

Станіслаў Лінкевіч: Уражанняў так многа, што цяжка выказаць іх адразу. Па-першае, я здзіўлен лікам студэнтаў. Я жыву у горадзе, які налічвае каля мільёна жыхароў. У нас ёсць універсітэт, у якім на гуманітарных, мастацкіх, эканамічных і тэхнічных факультэтах займаецца 10.000 чалавек. А вы жывеце у горадзе, дзе налічваецца каля 412 тысяч жыхароў, але студэнтаў у Мінску параўнальна з гэтай лічбай яуна больш.

Лукашоў: А ці ёсць у вас якія-небудзь іншыя навучальныя установы у горадзе?

Лінкевіч: У нас ёсць яшчэ некалькі сярэдніх навучальных устаноў, якія нагадваюць вашы політэхнікумы. Ёсць таксама вучылішчы накшталт вашых рамесніцкіх.

Лукашоў: Якое уражанне зрабілі на вас нашы студэнты?

Лінкевіч: Вашы студэнты вясёлыя, шумлівыя. Калі мы былі на вечары, прысвечаным 39-ай гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі, мы звярнулі увагу на тое, што у вас студэнты больш дружалюбныя. У нас студэнту, які прыехаў з іншай краіны, удзяляюць менш увагі, чым у вас.

Лукашоў: Што вы можаце сказаць наконт адукацыі, якую атрымоуваюць нашы студэнты?

Лінкевіч: Я не магу многа гаварыць аб гэтым. Але вашы студэнты, мне думаецца, атрымоуваюць больш рознабаковую адукацыю. Я быу два гады ва універсітэце у Канадзе. Метады выкладання у вас іншыя. Напрыклад, калі вы вывучаеце якога-небудзь пісьменніка, то перш за усё вывучаеце эпоху, у якой ён жыу. А у нас вывучаюць толькі яго біяграфію.

Лукашоў: У чым карэннае адрозненне нашых студэнтаў ад вашых?

Лінкевіч: Увогуле моладзь усюды аднолькавая. У нашых юнакоў і дзяучат таксама ёсць добрыя пачуцці, але іншы раз гэтыя пачуцці ідуць у дрэнным напрамку. Наша моладзь не бачыць сваёй будучыні. Яна не ведае, што яе чакае наперадзе. У нас няма сваёй прамысловасці. Таму спецыялістаў мы пасылаем у ЗША. Адтуль нам прывозяць паперу. А для таго, каб секчы лес або купляць паперу, не трэба быць асаблівым спецыялістам. Таму і атрымоуваецца, што малады чалавек набывае адукацыю ў Канадзе, а працаваць едзе у другую краіну.

Лукашоў: А каб стаць артыстам, таксама трэба ехаць у ЗША?

Лінкевіч: У нас у Канадзе усяго толькі два тэатры—у Манрыяле і Таранто. Няма сваёй айчыннай кінопрамысловасці. Прауда, зараз ужо вядзецца барацьба за тое, каб у нас былі свае тэатры, сваё кіно, свае кадры. Аб гэтым пачынаюць пісаць нават вядомыя газеты.

Вельмі дзіўным мне здаецца таксама тое, што у вас для вучобы прадастаўляюцца усе магчымасці. Для гэтага патрэбна толькі жаданне. У нас-жа наадварот: каб вучыцца, патрэбны грошы.

У вас можна быць другам у імя самой дружбы, дакладней кажучы, сябраваць бескарысна. А у нас сябруюць з чалавекам або таму, што ён багаты, або таму, што мае славу. Але гэта не значыць, што у Канадзе няма добрых сяброу.

Лукашоў: А што вам у нас не спадабалася?

Лінкевіч: Жыву я тут занадта мала, каб гаварыць **аб гэтым.**

Лукашоў: Што вы можаце сказаць аб фізічным выхаванні?

Лінкевіч: Я нічога не магу сказаць, таму што не пазнаёміуся яшчэ з гэтай справай. У нас, напрыклад, займаюцца спортам у абавязковым парадку толькі на I курсе. У далейшым можна займацца у секцыях. Але гэта не масавы спорт. Наогул, у нас ёсць магчымасці займацца спортам, але у нашай моладзі тэндэнцыі да гэтага выяуляюцца менш ярка, чым у вас.

Лукашоў: Ці займаецеся вы асабіста якім-небудзь відам спорту?

Лінкевіч: Летам я люблю гуляць у бейзбол, валейбол, люблю плаваць. У летнія месяцы я быу у прагрэсіўным маладзёжным лагеры, які раскінуўся **ў маляўнічым,** прыгожым месцы.

Яраслаў Кавалевіч: Я гуляю у баскетбол, люблю лавіць рыбу.

Валянціна Плаксіна: Я захапляюся баскетболам, валейболам. У нас у Канадзе з'яуляецца папулярным толькі рэгбі. Прауда, пасля наведвання нашай краіны камандай «Лакаматыва» павысілася цікавасць да футбола.

Лукашоў: Як арганізоуваюцца у вас вечары?

Лінкевіч: У нас бываюць складчыны. Агульных вечароу у нас не практыкуецца. Але у нас многа клубаў. Па статуту універсітэта дазваляецца арганізоваць клуб, калі збіраецца дзесяць чалавек. Клубы гэтыя могуць быць розныя: музыкі, філасофіі, драматургіі і г. д. Клубы арганізуюць свае вечары і запрашаюць на іх гасцей. Акрамя таго, тры разы у год наладжваюцца вялікія балы, на якія хлопцу трэба прыходзіць у чорным гарнітуры з кветкай у пятліцы, а дзяўчыне—у доугай сукенцы. Для такіх вечароу арэндуецца у горадзе якое-небудзь вялікае памяшканне. Вечар каштуе студэнту каля 20 долараў, што вельмі дорага.

Іншы раз наладжваюцца гульні паміж універсітэтамі, пасля чаго таксама арганізуюцца танцы. Драматычныя гурткі даюць спектаклі у горадзе, за што атрымліваюць грошы.

Кожны год наладжваецца маскарад. За лепшыя касцюмы факультэты атрымліваюць прэміі. вогуле у Канадзе ва універсітэце можна весяліцца цэлы год. Некаторыя ідуць сюды толькі дзеля гэтага.

Лукашоў: Ці ёсць у вас радыёвузел?

Лінкевіч: Ёсць, але ён перадае толькі канцэрты.

Лукашоў: А ці выпускаеце вы насценныя газеты?

Лінкевіч: Не. У нас ёсць толькі дошка аб'яу. Напрыклад, калі вы згубіце што-небудзь, то можна напісаць аб гэтым.

Два разы у год ва універсітэце выходзяць часопісы, у якіх друкуюцца мастацкія творы студэнтау. Тры універсітэты ў Канадзе выпускаюць штодзённыя газеты. Універсітэт ў Вепінеге выпускае газету праз два тыдні, прычым чарговы нумар заусёды прысвечаны жыццю якога-небудзь аднаго факультэта.

Лукашоў: Ці спадабалася вам, наша насценная газета «Look» на англійскай мове?

Лінкевіч: Вельмі нават. Я гатовы прыняць удзел у яе выпуску.

Лукашоў: Што вы можаце сказаць аб нашай самадзейнасці?

Лінкевіч: Мы былі на канцэрце ў кансерваторыі і на канцэрце у вас .Выступленне студэнтау з кансерваторыі нам больш спадабалася. Вельмі добра, што ваша моладзь імкнецца прыняць удзел у канцэртах. Нам асабліва спадабауся ваш танцавальны гурток.

Кавалевіч: А мне больш за усё спадабауся хор. Але мужчынскія сілы, на мой погляд, слабыя. У Канадзе студэнцкія групы мала звяртаюць увагі на народныя танцы, песні. Студэнты спяваюць еурапейскія, амерыканскія папулярныя песні. Крыху інакш выглядаюць і нашы танцавальныя групы. Больш выступаюць «боб ойны»—камедыянты з анекдотамі і жартамі.

У Вепінеге ёсць добрыя струнныя аркестры украінцаў.

Лукашоў: Што вы можаце сказаць аб нашых танцах?

Лінкевіч: Вельмі многа народу бывае. А манера ў асноуным тая-ж.

Лукашоў: А якая ваша думка аб джазе?

Лінкевіч: Мне ён асабіста не падабаецца.

Лукашоў: Ці былі вы у кіно?

Лінкевіч: Былі. Глядзелі «Забойства на вулицы Дантэ». Фільм нам вельмі спадабаўся.

Лукашоў: Як адносяцца ў Канадзе да СССР?

Лінкевіч: У Канадзе вельмі многа пішуць няпрауды аб Совецкім Саюзе. Але міралюбівая палітыка вашай краіны робіць сваю справу. Таму за апошні час недавер'е да Совецкага Саюза зменшылася.

Лукашоў: Ці плоціць у Канадзе стыпендыі?

Лінкевіч: Не. Прауда, іншы раз багатыя людзі пасля смерці аддаюць свае грошы на арганізацыю стыпендый.

Лукашоў: А ці ёсць у вас інтэрнаты?

Лінкевіч: Інтэрнатау няма. Студэнты здымаюць прыватныя кватэры у горадзе. Бывае, што група студэнтаў купляе сабе дом.

Лукашоў: Скажыце, калі ласка, Яраслаў і Валянціна, па якому класу вы вучыцеся у кансерваторыі?

Адказ: Мы вывучаем ігру на фартэпьяно, вучымся дырыжыраваць, вывучаем гісторыю музыкі, народныя інструменты, ходзім у харэаграфічную школу.

Лукашоў: Якую музыку вы любіце?

Кавалевіч: Я люблю класічную і народную. Раней я не меу магчымасці іграць творы класічнай музыкі. Як мы ужо гаварылі, да джазу адносімся адмоуна, але мы за добры джаз.

Лукашоў: Хто ваш любімы кампазітар?

Кавалевіч: Я вельмі люблю Чайкоускага.

Лукашоў: Каго з рускіх кампазітараў больш за усё любяць у Канадзе?

Кавалевіч: Чайкоускага, Рымскага-Корсакава, Пракофьева, Шастаковіча.

У заключэнне гутаркі Яраслаў Кавалевіч, Станіслаў Лінкевіч і Валянціна Плаксіна папрасілі перадаць прывітанне студэнтам нашага універсітэта.

В. ЛУКАШОЎ,
студэнт I курса геаграфічнага факультэта.

На здымку: С. Лінкевіч сярод студэнтау БДУ.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

* * *

25 лістапада студэнты лесатэхнічнага інстытута праводзілі адкрыццё зімняга сезону. Яны запрасілі да сябе студэнтаў педагагічнага інстытута і нашага універсітэта. У раёне станцыі «Зялёная» адбылося спаборніцтвы лыжнікаў. Спартсмены універсітэта дабіліся на іх добрых вынікаў. Студэнт III курса хімфака І. Александровіч (здымак уверсе) першым прайшоу 5 кіламетраў з вынікам 21 мінута 01 секунды. Менш паспяхова выступілі астатнія прадстаунікі універсітэта на гэтых спаборніцтвах. Шостае месца з часам 22 мінуты 27 секунд заняу студэнт III курса фізіка-матэматычнага факультэта А. Пальцау. А. Іўко (V курса фізмата) паказаў час 23 мінуты 21 секунда і аказаўся на дзесятым месцы.

Сярод жанчын дыстанцыю 3 км з лепшым часам (14 мінут 27 секунд) прайшла студэнтка V курса фізмата В. Караткевіч (2). Нядрэнна выступіла студэнтка IV курса хімфака першаразрадніца А Ліннік. Яе вынік 18 мінут 03 секунды.

Пакуль суддзі падводзяць вынікі спаборніцтваў, нядрэнна і перакусіць (здымак унізе).

А. СІЛЕНКОЎ.

Пачаўся розыгрыш першынства ВНУ горада Мінска па шахматах. У гэтым туры сустрэліся каманды медінстытута і нашага універсітэта. Перамогу атрымалі шахматысты БДУ.

НА ЗДЫМКУ: (на пярэднім плане — Марат Кузняцоў (злева), студэнт медыцынскага інстытута, і Захар Ліўшыц, студэнт фізмата БДУ. Партыя закончылася унічыю. *Фота Э. Дамарацкага.*

ВЕРШЫ НАШЫХ ПАЭТАЎ

Урачу В. В. АЛЬШЭЎСКАЙ

Помню, Вы прышлі лагодная
Да мяне у цяжкі час.
Вольга Восіпаўна, родная,
Не забуду вас.

Я стаяу над самай кручаю
І не бачыў жалю дна.
Сэрца горнасцю пякучаю
Раніла вясна.

Як на Вашы рукі падаў я
Ад бяссонніцы цяжкой,
Як вы лекамі, парадамі
Мне далі спакой.

Вы зганялі здані шэрыя,
Што кружылі нада мной,
Вы паілі мяне вераю,
Як жывой вадой.

Зноў я бегаю на лекцыі,
Адчуваю дзень і ноч.
Даражэйшыя ін'екцыі—
Ласку Вашых воч.

І калі з душою яснаю
Я прыду у школьны клас,
Вольга Восіпаўна,—шчасны я—
Не забуду Вас.

М. ШУШКЕВІЧ

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19

АТ 11091б **Друкарня выдавецтва БДУ.** Зак. 1302 **Тыраж 2000**